**ВОДЗЫЎ**

на аўтарэферат дысертацыі В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

Вывучэнне другасных намінацый прыцягвае пільную ўвагу па прычыне прадуктыўнасці іх утварэння, неабходнасці сістэматызацыі адзінак, якія ўдзельнічаюць у працэсе семантычнай дэрывацыі, і спецыфікі адлюстравання сістэмна-структурных моўных адносін пры пераходзе з аднаго семантычнага поля ў другое. Абраная даследчыкам тэма вылучаецца запатрабаванасцю ў сучаснай навуковай парадыгме. Непасрэдны аб’ект назірання – альфакторная сфера, прадстаўленая праз прызму семантычнай дэрывацыі – варта ўвагі з прычыны неабходнасці далейшага, больш глыбокага спасціжэння феномена альфакторнасці ў мове. Альфакторнае ўспрыманне ў большасці выпадкаў носіць суб’ектыўны характар, пры гэтым узуальныя сродкі для апісання пахаў выкарыстоўваюцца абмежавана. Актыўна выкарыстоўваюцца моўныя аказіянальныя адзінкі розных донарскіх сфер, уключаныя ў працэс семантычнай дэрывацыі і абумоўленыя адрозненнямі нацыянальна-гістарычных, культурных уяўленняў носьбітаў мовы, асаблівасцямі іх менталітэту, спецыфікай лексічнай і граматычнай сістэм беларускай і англійскай моў.

Зыходзячы з інфармацыі, прадстаўленай у аўтарэфераце, праца В. І. Жука характарызуецца лагічнасцю, паслядоўнасцю моўнага аналізу, абгрунтаванасцю і дакладнасцю вынікаў. Дакладнасць вынікаў дысертацыі забяспечваецца грунтоўнай тэарэтычнай базай, значным аб’ёмам фактычнага матэрыялу і яго шматаспектнай інтэрпрэтацыяй. Паслядоўнасць моўнага аналізу, абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў дысертацыі сведчаць пра глыбокае валоданне В.І Жуком як тэарэтычнай базай, так і методыкай навуковага даследавання. Атрыманыя грунтоўныя вынікі забяспечаны і тым, што ў працы ажыццяўлялася інтэграцыя мовазнаўства з іншымі навукамі (гісторыяй, літаратуразнаўствам, псіхалогіяй, культуралогіяй).

У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі дысертант ажыццяўляе комплекснае апісанне лінгвістычнай прыроды альфакторных дэфініцый, выяўляе масіўны корпус другасных альфакторных лексіка-семантычных варыянтаў, праводзіць класіфікацыю альфакторных субстантываў, ад’ектываў і дзеясловаў, структуруе асноўныя мадэлі альфакторнай семантычнай дэрывацыі, характарызуе тыпы семантычнай эквівалентнасці беларускіх і англійскіх альфакторных адзінак.

Навуковая навізна і значнасць дысертацыйнага даследавання вызначаецца тым, што была распрацавана метадалогія класіфікацыі другасных альфакторных намінацый, устаноўлены мадэлі ўтварэння другасных лексіка-семантычных варыянтаў, праведзена дыферэнцыяцыя ўзуальных і аказіянальных дэфініцый альфакторнай скіраванасці. Супастаўляльнае даследаванне беларускіх і англійскіх альфакторных лексічных адзінак дазволіла выявіць тыпы міжмоўных карэляцый з адносінамі семантычнага супадзення, частковай эквівалентнасці і безэквівалентнасці. Упершыню ў лексікаграфічнай практыцы створаны «Беларуска-англійскі тлумачальны слоўнік альфакторных намінацый».

Асноўныя распрацоўкі дысертацыі В. І. Жука характарызуюцца лінгвакультуралагічнай скіраванасцю, сведчаць аб істотнай практычнай значнасці работы і маюць важнае значэнне для сучаснай кампаратывістыкі. Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы прац па параўнальнай тыпалогіі, дэрываталогіі, пры выкладанні практыкі вуснага і пісьмовага маўлення беларускай і англійскай моў, пры ўкладанні беларуска-англійскіх слоўнікаў. Як сведчыць аўтарэферат, дысертацыя прайшла апрабацыю, яе вынікі ў дастатковай меры адлюстраваны ў навуковым друку (12 публікацый у розных перыядычных выданнях).

Такім чынам, дысертацыйнае даследаванне В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» з'яўляецца самастойным, лагічным і завершаным даследаваннем на актуальную тэму, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства.

Загадчык кафедры беларускай і рускай моў
установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны
медыцынскі ўніверсітэт" кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Т.М. Мельнікава

Подпись Мельниковой Т.Н. заверяю

–омачёнок М.А